УДК 947.6

У. К. Коршук

# БЕЛАРУСЬ НАПЯРЭДАДНІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

У канцы 1930-х пачатку 40-х гг. Беларусь дасягнула значных поспехаў у развіцці эканомікі, культуры, грамадска-палітычным жыцці. Расла ўдзельная вага прадуктаў беларускай прамысловасці ў агульнасаюзнай вытворчасці.

У БССР развівалася станкабудаванне, разгортваліся абаронныя галіны прамысловасці. Планавалася будаўніцтва ў Мінску і Магілеве авіацыйных прадпрыемстваў, у Віцебску і Баранавічах – танкарамонтных заводаў. На працягу 1940 і пачатку 1941 г. былі рэканструяваны чыгуначныя дарогі ў заходніх абласцях Беларусі. Расло жыллевае будаўніцтва. І ўсе ж рост гарадского насельніцтва апярэджваў павялічэнне жыллевага будаўніцтва. Назіраўся рост заработнай платы, хаця, нягледзячы на намінальнае павышэнне, яе рэальная вартасць толькі ў 1940 г. дасягнула ўзроўню 1928 г. [1, с. 139].

І ўсё ж усталяваная да таго часу сістэма дырэктыўнага планавання і адміністратыўна – каманднага кіраўніцтва з боку партыйна-дзяржаўных органаў стрымлівала развіцце краіны, не садзейнічала ўмацаванню зацікаўленасці ў працы, асабліва ў сельскагаспадарчай вытворчасці. З вескі ўсё больш выціскалі аданаасобніка. Памнажэнне грамадскай уласнасці ставілася на першы план. З сярэдзіны 1939 г. у калгасах рэспублікі быў устаноўлены мінімум выпрацоўкі працадзён – 80 [1, с. 145]. Пры гэтым іх налічэнне ставілася ў залежнасць ад дасягнутай ураджайнасці, прадукцыйнасці жывелы і іншых паказчыкаў развіцця вытворчасці. Прысядзібным участкам, як адной з крыніц дабрабыту, адводзілася дапаможная роля. І гэта пры тым, што выплаты па працадням былі невялікія і ажыццяўляліся не рэгулярна. Аплата працы калгаснікам праводзілася па астатковым прынцыпе, пасля выканання планаў і заданняў па дзяржаўным пастаўкам. У выніку калгаснікі заставаліся самай нізкааплатнай катэгорыяй насельніцтва па заробках і ўзроўню жыцця.

Летам 1939 г. у Беларусі пачалася ліквідацыя хутарскіх прысядзібных участкаў. Усе сяляне ссяляліся ў адно месца. Пры гэтым памер зямлі абмяжоўваўся. За 1938 – 1940 гг. з хутароў у калгасныя пасёлкі было перасялана каля 160 тыс. гаспадарак, сярод якіх і

значная колькасць аднаасобнікаў, вымушаных уступіць у калгасы [5, с. 40]. Гэта мера выклікала незадаволенасць сялян, садзейнічала і ўзнікненню антысавецкіх настрояў у некаторых з іх.

У 1938 г. праводзіцца шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне працоўнай дысцыпліны, павышэнне прадукцыйнасці працы, умацавнне абароназдольнасці краіны. У снежні Саўнарком СССР прыняў пастанову “Аб увядзенні працоўных кніжак”, у якіх адлюстроўвалася ўся працоўная дзейнасць чалавека, яго адносіны да працы.

Пагаршэнне міжнароднага становішча, магчымасць вайны вымусілі кіраўніцтва СССР у чэрвені 1940 г. прыняць Закон аб пераходзе на 8-гадзінны рабочы дзень і на 7- дзенны рабочы тыдзень, які забараняў самавольна пакідаць работу [2, с. 4]. У выніку на шэрагу прадпрыемстваў Беларусі павысілася працоўная дысцыпліна, вырасла прадукцыйнасць працы, узрос выпуск прадукцыі, зменшылася цякучасць кадраў, спазненні на работу, прагулы. І ўсе ж, як сведчаць дакументы, далёка не ўсе ў рэспубліцы аднолькава ўспрынялі гэта рашэнне. Некаторыя выказвалі сваю нязгоду працаваць больш без павялічэння заробку, заставацца прывязаным да аднаго месца працы.

Не ўсе і не адразу зразумелі значэнне стварэння ў 1940 г. школ працоўных рэзерваў, лічачы прафесійна-тэхнічнае навучэнне заняволеннем дзяржавай чалавека працы. На самой жа справе ў выніку стварэння Дзяржаўных працоўных рэзерваў быў налажаны сістэматычны прыток у прамысловасць, будаўніцтва і на транспарт кваліфікаваных рабочых, што ўзмацняла эканамічную і ваенную моц дзяржавы. У Беларусі было створана 15 рэмесных вучылішчаў і 40 школ ФЗН, у якіх навучалася каля 17 тыс. чал. [3, с. 212]. Значная ўвага ў тыя гады надавалася сацыяльна-культурным мерапрыемствам. З ліку грамадскіх фондаў людзі атрымоўвалі дапамогу і выплаты па сацыяльнаму страхаванню, штогод аплачываемыя адпачынкі, пуцеўкі ў санаторыі і дамы адпачынку, бесплатную медыцынскую дапамогу, пенсіі і стыпендыі. На сацыяльна-культурныя мерапрыемствы ў 1937 – 1940 гг. выдзяленні ўзраслі ў Беларусі ў тры разы і склалі 101,4 млн. руб.

Напярэдадні вайны адпаведную ўвагу ўдзялілі ўдасканаленню адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення Беларусі. З ліпеня 1930 г., калі былі ліквідаваны акругі, створаныя ў 1924 г. замест уездаў і валасцей, асноўнай тэрытарыяльна-адміністрацыйнай адзінкай ў Бела-

русі лічыўся раен. У выніку з цэнтру на прамую кіравалі дзейнасцю амаль 90 раёнаў рэспублікі. Гэта стварала цяжкасці ўраду і наркаматам у ажыццяўлені кіраўніцтвам імі. Менавіта неабходнасць у стварэнні прамежкавага звяна паміж рэспубліканскім цэнтрам і раёнамі прывяла да стварэння абласцей, якое было ўведзена ў Беларусі ў студзені 1938 г. Тады было арганізавана 5 абласцей: Віцебская, Гомельская, Магілеўская Мінская і Палеская. У лютым, існуючыя на той час раёны, былі размеркаваны паміж заснаванымі абласцямі [2, с. 9].

Значныя змены ў адміністратыўна-тэрытарыяльным падзеле Беларусі адбыліся і пасля яе ўз'яднання ў верасні 1939 г. Тэрыторыя, якая адыходзіла да БССР, уключала цалкам 33 уезды і часткова 3 уезды Беластоцкага, Варшаўскага, Віленскага, Навагрудскага і Палескага ваяводстваў. У Заходняй Беларусі было створана 5 абласцей. З улікам вопыту ўсходняй часткі Беларусі ствараліся раены, якія павінны былі мець 35 – 50 тыс. насельніцтва і тэрыторыю 900 – 1400 км кв. У студзені 1940 г. у Заходняй Беларусі былі ліквідаваны ўезды і створаны 101 раён [3, с. 212].

Адначасова з раённым дзяленнем праводзілася работа па арганізацыі сельсаветаў. У той жа час ліквідаваліся нацыянальныя саветы. У якасці прычын прыводзіліся лічбы, якія сведчылі аб тым, што тытульная нацыя складае меншасць насельніцтва, альбо рабіліся спасылкі на "пажаданне людзей". Адным словам, з 1938 г. гаворка вядзецца аб фармальнасці існавання нацыянальных саветаў, а не аб іх варожасці да савецкай улады, шпіянажы на карысць іншых дзяржаў.

Кіраўніцтва Беларусі дабівалася грамадскай актыўнасці працоўных, мабілізуючы іх на вырашэнне задач індустрыялізацыі, рэканструкцыі прамысловасці рэспублікі, калгаснага і саўгаснага будаўніцтва, развіцце культурна-асветнай і адукацыйнай работы. І, хаця партыя ў той час усе больш падпарадкоўвала дзейнасць Саветаў, у палітычнай арганізацыі грамадства ім адводзілася асобае месца. У час выбараў ставілася задача забяспечыць як мага больш удзел выбаршчыкаў і выбранне ўсіх кандыдатаў у дэпутаты, якія былі падабраны і ўзгоднены з адпаведнымі партыйнымі камітэтамі. З гэтай мэтай вялася шырокая агітацыйна-масавая работа, якая давала адпаведныя вынікі.

Напярэдадні вайны ў Беларусі актыўна вялася работа па ўзмацненню абараназдольнасці краіны. У сувязі з пагранічным палажэннем з Германіяй беларускія землі разглядаліся ў той час як вельмі

важная тэрыторыя для магчымых ваенных дзеянняў. Таму значная ўвага ўдзялялася рэканструкцыі шасэйных і грунтовых дарог, пераабсталяванню чыгункі, будаўніцтву ўмацавных раенаў.

На тэрыторыі Беларусі ў 1920 – 1930 –х гг. была створана сістэма абароны. У 1927 – 1938 гг. пабудавалі Полацкі, Мінскі, Мазырскі ўмацаваныя раены. У 1938 – 1939 гг. ішло ўзвядзення Слуцкага ўмацаванага раена. Гэтыя збудаванні прыкрывалі важныя стратэгічныя напрамкі. Але ў сувязі са зменай у 1939 г. заходняй граніцы СССР яны аказаліся ў глубокім тыле [4, с. 14].

Таму кіраўніцтвам СССР было прынята рашэнне аб пабудове ў 1940 – 1941 г. новых чатырох умацаванняў. Сярод іх – Гродзенскі, Асавецкі, Замброўскі і Брэсцкі ўмацаваныя раёны, агульнай даўжынею каля 450 км. Яны павінны былі перакрыць амаль усю заходнюю граніцу Беларусі, з тым каб затрымаць наступленне праціўніка на граніцы, і даць магчымасць сваёй арміі правесці мабілізацыю і ўступіць у бой.

Кіраўніцтва Беларусі мабілізавала значныя людскія і матэрыяльныя рэсурсы на абароннае будаўніцтва. Для будаўніцтва ўмацаваных раёнаў па вольнаму найму, а часта па прымусовай павіннасці прыцягвалася насельніцтва, выкарыстоўвалі працу спецыяльных камсамольскіх атрадаў, будаўнічных батальенаў, рэгулярных вайсковых часцей. Штодзенна працавала 25 – 30 тыс. чал. [1, с. 181]. Аднак дзейнасць людзей не заўседы была скардынавана, іх часта не забяспечвалі работай, выкарыстоўвалі не па прызначэнню.Не было адпаведнага ўзаемадзеяння грамадскага і выйсковага кіраўніцтва, зрываліся пастаўкі абсталявання, цэменту і інш. Мелі месца і сабатаж, здрадніцтва. Усё гэта стрымлівала абароннае будаўніцтва. Да таго ж і вышэйшае кіраўніцтва СССР не спяшалася з прывядзенням у боегатоўнасць прыгранічных акруг у 1941 г. Меркавалася, што нямецкая армія яшчэ не падрыхтавана да ваенных дзеянняў супраць СССР. У немцаў не было цеплага абмундзіравання, патрэбных гаруча-змазачных матэрыялаў і інш. У такой абстаноўцы прывядзенне ў 1941 г. у боегатоўнасць прыгранічных тэрыторый лічылася заўчасным. Думалі, што гэта можа справакаваць ускладненне адносін з Германіяй, якая, як здавалася да 1942 – 1943 г. не мела магчымасці нападзення на СССР.

На самой справе ўсё аказалася не так. Гітлераўцы ўжо з ліпеня 1940 г. пачалі засяроджваць свае войскі на тэрыторыях блізкіх да савецкай граніцы. У пачатку 1941 г. нямецкія войскі яшчэ бліжэй

размяшчаюцца да Беларусі, ідзе іх узмоцненае прасоўванне да заходняй граніцы СССР. Яны паступова займаюць зыходныя пазіцыі на незначнай адлегласці да беларускай мяжы. На тэрыторыю Беларусі засылаюцца дыверсійныя групы, актыўна вядзецца разведвальная дзейнасць, нямецкія самалеты раз по раз парушаюць савецкую паветраную прастору. Адпаведныя службы сачылі за тым, што адбывалася, але лічылася, што звесткі аб падрыхтоўцы Германіі да нападу на СССР з'яўляюцца безпадстаўнымі. У выніку будаўніцтва ўмацаваных раёнаў завершана не было. З пачаткам вайны яны не выканалі задач, якія перад імі ставіліся.

У няпростым становішчы аказаліся войскі Заходняй Асобай вайсковай акругі, якія размяшчаліся на тэрыторыі ад Смаленска да Беластока, і мелі задачу прыкрыць 470 км. заходняй граніцы краіны. У іх складзе было 45 дывізій [4, с. 16]. Але па асабоваму складу, баявой тэхніцы, сродках транспарту быў значны некамплект. У пачатку верасня 1939 г., улічваючы міжнародную напружанасць, было прынята рашэнне правесці частковую мабілізацыю ў Чырвоную Армію. На тэрыторыю Заходняй Асобай акругі было прызвана з запасу больш 380 тыс. чал. Але ўжо з 29 верасня "ў сувязі з нармалізацыяй становішча на заходніх граніцах СССР" пачалося скарачэнне колькасці чырвонаармейцаў. Да снежня 1939 г. з войск Заходняй акругі было звolена ў запас 280 тыс. чал. [4, с. 6].

У непасрэднай блізкасці да граніцы знаходзілася ў той час нязначная колькасць падраздзяленняў, якія павінны былі ўсюды аднолькавымі сіламі ўтрымліваць ворага. Нягледзячы на значную колькасць вучэбных мерапрыемстваў, падрыхтоўка войск была не на адпаведным узроўні. Сістэма забяспячэння была слаба прыстасавана да баявых дзеянняў. Наглядаючы за перадыслакацыяй немцаў, наша разведка рабіла вывад, што яны ў асноўным займаюцца абароннымі збудаваннямі. А менавіта ў Гітлера і была мэта стварыць такое ўражанне.

У выніку Чырвоная Армія не паспела сканцэнтравацца і разгарнуцца на Заходнім фронце і ў момант нямецкага нападзення аказалася не падрыхтаванай да рашучых стратэгічных дзеянняў.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ

1. Платонаў, Р.П. Беларусь у міжваенны перыяд / Р.П. Платонаў. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. – Мінск, 2000.

2. Минская область в документах и материалах. Выпуск 1. Начало. Январь 1938 г. – 1941 г. – Минск, 2007.
3. Накануне. Западный особый военный округ (конец 1939 г. – 1941 г.). Документы и материалы. – Минск, 2007.
4. Гісторыя Беларусі (1917 – 1945) / П.І. Зялінскі і інш. – Мінск, 2012.
5. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941 – 1945 / А.А. Коваленя и др. – Мн.: БЕЛТА, 2005. – 544 с.

УДК 94(476)

С. Я. Новікаў

## АБАРОНЧЫЯ БАІ Ў БЕЛАРУСІ ЛЕТАМ 1941 ГОДА Ў АДЛЮСТРАВАННІ НОВЫХ ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ КРЫНІЦ

Абарончыя баі Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. не застаюцца па-за ўвагай сучаснай расійскай і беларускай гістарычнай навукі [1; 2; 3; 4]. Аднак пасля знаёмства з некаторымі новымі працамі ўзнікае шэраг прынцыповых пытанняў, сярод якіх адным з першым з'яўляецца вызначэнне ступені карэляцыі гістарыяграфічных фактаў і дакументальных крыніц аб гісторыі баявых дзеянняў у Беларусі ў першыя два месяцы Вялікай Айчыннай вайны.

Разгледзім толькі некалькі тэзісаў з новага 12-томнага расійскага выдання, заключны том якога выйшаў напярэдадні 70-годдзя Вялікай Перамогі [5]. Звернемся да зместу 2-га тома гэтага выдання, у якім разглядаецца пачатковы перыяд вайны, у тым ліку, адлюстраваны падзеі ў Беларусі летам 1941 г., і прапануем пазнаёміцца з новымі вынікамі іх навуковага аналізу на аснове выкарыстання метаду гістарыяграфічнай і крыніцазнаўчай кампаратывістыкі [2].

Прааналізуем некаторыя з іх на прыкладзе абарончых баёў Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. Так, на стар. 736 2-га тома чытаем наступны тэзіс: «На 22 июня 1941 г. Брестскую крепость защищали порядка 3,5 тыс. человек 6-й и 42-й стрелковых дивизий 28-го стрелкового корпуса РККА» [2, с. 736]. Заўважым, што гэты тэзіс фігураваў у савецкай гістарыяграфіі абароны Брэсц-